Пленарное заседание

***В.Ю. Бароўка***

## КАШТОЎНАСНЫЯ ПРЫЯРЫТЭТЫ ЖАНЧЫНЫ-АДРАДЖЭНКІ: НА МАТЭРЫЯЛЕ ЎСПАМІНАЎ "СЦЕЖКАМІ ЖЫЦЦЯ" ПАЎЛІНЫ МЯДЗЁЛКІ

Паўліна Вінцэнтаўна Мядзёлка (1993–1974) – адзін з ідэолагаў і практыкаў беларускага адраджэнскага руху пачатку ХХ стагоддзя. Гэтай жанчыне Янка Купала некалі прапаноўваў руку і сэрца, прысвяціў шэраг вершаў, у якіх выказаў гісторыю свайго кахання. Паўліна Мядзёлка ўвайшла ў айчынную гісторыю як грамадскі дзеяч, актрыса, педагог, пісьменніца.

У 1974 годзе была апублікавана кніга ўспамінаў "Сцежкамі жыцця". Там расказвалася пра дзіцячыя і юнацкія гады, пра лёс Мядзёлкі падчас грамадзянскай вайны. Заканчвалася ж кніга апісаннем прыезду Паўліны разам з братам у савецкую Беларусь на сталае месца жыхарства ў 1925 годзе. Амаль праз дваццаць год, да юбілею Паўліны Мядзёлкі часопіс "Полымя" ў 1993 годзе змясціў тую частку ўспамінаў, якая не ўвайшла (ды ў савецкі час па ідэалагічных і маральных прычынах) не магла ўвайсці ў кнігу 1974 года. Нягледзячы на розніцу ў часе выданняў, на розную ступень асвятлення жыццёвых рэалій мінулага, абедзве публікацыі (1974 і 1993 года) даюць дастаткова выразнае ўяўленне пра аксіялагічныя прыярытэты актыўнай удзельніцы беларускага адраджэнскага руху.

Л.Я. Гінзбург слушна заўважыла: "Літаратура ўспамінаў, аўтабіяграфічнай формы, споведзей і "думак" вядзе прамую размову пра чалавека. Яна падобная да паэзіі адкрытай і настойлівай прысутнасцю аўтара" [1, с. 133]. Асобасны пачатак – дамінантны ў мемуарнай прозе і ўспамінах, як, дарэчы, і ацэначны. Ва ўспамінах аўтар не толькі характарызуе час і рознага кшталту асоб, але і сябе самога.

Паўліна пастаянна падкрэслівае сваю любоў да беларускай зямлі і беларускай культуры. У анкеце падчас вучобы ў гімназіі яна напісала наступныя адказы на пытанні: "1. Вероисповедание – римско-католическое. 2. Сословие – крестьянка. 3. Национальность – белоруска. 4. Родной язык – белорусский". У гімназіі такую анкету апякунка падпісаць не захацела і незадаволена сказала: "Што гэта яшчэ за выдумкі такія? Скуль гэта ўзяліся якіясь беларусы і нейкая беларуская мова? Раз вы каталічка – значыцца, і полька. Ніякай беларускай мовы не існуе. Вы ж па-польску гаворыце". "Так, – кажу, – з вамі я гавару па-польску, з настаўнікамі ў гімназіі – па-руску, з нашай немкай – па-нямецку, дома зроду мае дзяды і прадзеды і я з бацькамі – толькі на роднай мове гаварылі – па-беларуску. Рэлігійная прыналежнасць – гэта адно, а нацыянальная – зусім іншае. Французы, італьянцы па рэлігіі – каталікі, аднак палякамі сябе не называюць" [2, с. 45]. Яе абражаў недавер да беларусаў рымска-каталіцкага веравызнання ў царскай Расіі. У "Сцежках жыцця" 1974 года нямала дэкларацыйных заяў патрыятычнага характару, як урачыстае абяцанне беларускай рацэ: "Клянуся табе, бацька Нёман, што ўсе свае сілы, а калі трэба і жыццё аддам свайму абяздоленаму народу" [2, с. 129]. Патрыятызм і самаахвярнае служэнне Бацькаўшчыне былі для Паўліны арганічнай часткай жыцця, але гэта не быў патрыятызм міцкевічаўскага Конрада Валенрода. Напрыклад, на прапанову Івана Луцкевіча стаць дзеля грашовай падтрымкі беларускай справы кампаньёнкай княгіні Радзівіл адказала: "Крывіць душою я не ўмею і не хачу. Шукайце сабе іншую кандыдатку на такія справы" [2, с. 95]. У невялікім раздзельчыку "Беглыя нататкі для памяці" яна згадвала пра самаахвярнага адраджэнца Вацлава Іваноўскага. У часы Вялікай Айчыннай вайны лёс яго склаўся трагічна, ён быў бургамістрам Вільні, перадаваў звесткі партызанам і нібыта партызаны яго расстралялі. На думку Паўліны Мядзёлкі, такі складаны лёс і самаахвярнае служэнне людзям таленавіта ўвасобіў у вобразе доктара Савіча з рамана "Сэрца на далоні" Іван Шамякін. Паўліна непрымальна ставілася да меркантыльнасці з боку паасобных адраджэнцаў, таму адзначала ва ўспамінах пра 1920-я гады: "У першыя дні майго прыезду з Латвіі мяне ўражвала нейкае буржуазна-мяшчанскае, нават гандлярскае перараджэнне тых, якіх я раней ведала як самаадданых, безінтэрасоўных грамадзянскіх дзеячаў, якія не толькі не думалі аб сваёй карысці, выгадзе, але апошнія капейкі свае аддавалі на агульнаграмадскую справу" [3, с. 211].

Паўліна рана навучылася чытаць, заўсёды мела вялікую ахвоту да кніг. У час першай рускай рэвалюцыі ў бацькаў двор нехта падкінуў скрутак газет. Там аказаліся два першыя нумары "Нашай долі", "Дудка беларуская" Мацея Бурачка і розныя брашуры на беларускай і рускай мовах. Паўліну Мядзёлку, па яе словах, моцна ўразіла прадмова да зборніка "Дудка беларуская". На дзіцячай елцы арганізатары свята папрасілі малую Паўліну прачытаць на памяць "Альпугарскую баладу" з паэмы Адама Міцкевіча "Конрад Валенрод", аднак дзяўчына замест знакамітага твора Міцкевіча, прасякнутага ідэяй змагання за свабоду і радзіму любымі шляхамі, з вялікім поспехам прачытала "Хрэсьбіны Мацюка" Мацея Бурачка, у аснове якога думка пра абуджэнне чалавечай і нацыянальнай годнасці беларуса.

Паўліну Вінцэнтаўну, як і іншых адраджэнак, вылучала актыўная жыццёвая пазіцыя, жаданне і імкненне ўдзельнічаць у змяненні жыцця да лепшага. Яшчэ ў час вучобы ў віленскай прыватнай жаночай гімназіі яна пазнаёмілася з удзельнікамі сацыялістычнага гуртка, стала наведваць беларускія вечарыны,

сувязь з нацыянальна-патрыятычным крылом маладой беларускай інтэлігенцыі яшчэ больш вырасла ў час знаходжання ў Пецярбургу.

Паўліна Мядзёлка высока ставіла веды і вучобу. Як сведчаць успаміны, яна пастаянна развівалася, займалася самаадукацыяй. Калі трапіла ў Пецярбургу на вышэйшыя камерцыйныя курсы, то, па яе прызнанні, з першых дзён адчула, што істотна адстала ад іншых студэнтаў і не можа падтрымаць гутарку, а таму стала ўзмоцнена займацца самаадукацыяй. У людзях яе абражалі абыякавасць да навукі, нізкі інтэлектуальны ўзровень.

Мядзёлку захаплялі прафесіяналізм і працавітасць. Яна прызнавалася ў кнізе "Сцежкамі жыцця", што глядзела ўлюбёнымі вачамі на Янку Купалу ў Пецярбургу, калі той чытаў свае вершы. Для яе гэты чалавек тады быў увасабленнем менавіта працавітасці. У Першым таварыстве беларускай драмы і камедыі маладую актрысу захапляла "самаадданая праца, праца поўная своеасаблівай рамантыкі" [2, с. 113]. Пра сябе як настаўніцу яна заўважала: "Школа адбірала ўвесь мой час" [2, с. 146]. Калі Паўліна ў 1947 годзе пераехала з Масквы ў Будслаў і стала працаваць у школе, то яе глыбока пакрыўдзіла стаўленне чыноўнікаў ад адукацыі ў асобе дырэктара і завуча школы да настаўнікаў, іх дробная помслівасць. Паўліна не пагадзілася з прапановай завуча самой ставіць ацэнкі за ненаведаныя ім урокі. Калі кіраўніцтва школы стала зневажаць настаўніцу, то яна сабрала свае характарыстыкі з маскоўскіх школ і паехала ў райана, каб давесці, што здатная працаваць у школе і адпавядаць ролі настаўніка. У Будслаўскай школе яна адразу ж арганізавала мастацкую самадзейнасць, на адласным конкурсе-аглядзе яе хор здзівіў усіх, а журы адзначыла не толькі добры густ, але і мастацкія ды арганізатарскія здольнасці кіраўніка хору. Паводле Мядзёлкі, сапраўдны настаўнік толькі той, вучыцца, хто хто закране струны душы вучня.

В.Р. Бялінскі ў адным з артыкулаў заўважыў, што вартасці жанчыны характарызуе той мужчына, якога яна выбірае. Пра мужа, Тамаша Грыба, Паўліна Мядзёлка лаканічна напісала як пра "самае труднае, самае светлае і самае балючае ў маім жыцці" [4, с. 186]. Асновай шлюбу для яе былі каханне і агульныя грамадскія інтарэсы. Як вядома, шлюб Мядзёлкі распаўся з-за рознасці палітычных праграм мужа і жонкі.

Паўліна Вінцэнтаўна прызнавалася, што з маладых гадоў яе не задавальняла традыцыйная схема жаночага лёсу, у якой галоўнай асобай павінен стаць муж: "Маці імкнулася навучыць мяне шыць, гатаваць страву, даглядаць жывёлу, каб пасля выдаць замуж за якога засцянковага шляхціца. А мяне такая доля зусім не радавала" [2, с. 14]. Выхаваная ў патрыярхальнай сям'і, маці абуралася дачкой: "От, ні да якай хатняй работы не здатна. Цэлымі днямі не разлучаецца з кніжкай. А колькі яна ўжо перачытала за зіму, дык, мусіць, і на трох возах не ўмесціш" [2, с. 15]. Калі не атрымалася ў Вільні здаць экзамен на вучаніцу аптэкара, то Паўліну найперш засмуціла: "Зноў няньчыць малодшых братоў, займацца хатняй гаспадаркай, вучыцца шыць і слухаць вечныя папркі за сваю няздатнасць да гэтых работ" [2, с. 21]. Іранічнае стаўленне выклікала ў яе аднакласніца-гімназістка Марыля Давякоўская, бо, бо ўсе "яе жыццёвыя інтарэсы былі накіраваны на туалеты, модныя прычоскі ды флірт з хлопцамі" [2, с. 34]. Адзінокай яна адчувала сябе ў кампаніі жонак былых адраджэнцаў: "У 1925–1927 гг. сярод беларускіх культурнікаў быў звычай наладжваць так званыя суботнікі па чарзе ў кожным доме" [3, с. 210]. Жонкі, тупаючы ад кухні да стала, памагалі гаспадыні і пры гэтым вялі гутаркі аб новых модах, крытычна аглядалі сукенкі і туфлі адна адной, насміхаліся з кагосьці, у каго на стале не было сурвэтак або талеркі былі рознага фасону" [3, с. 210].

Мядзёлка нічога не мела супраць мужчынскай галантнасці. На першым часе па прыездзе ў савецкую Беларусь у сярэдзіне 1920-х гадоў яе здзіўлялі грамадскія ўяўленні пра паводзіны ў прысутнасці жанчыны і паводзіны некаторых жанчын. Калі брат у сталовай стаў ёй дапамагаць апранаць жакет, прысутныя зарагаталі. Загадчык Акрздрава з Клімавіч Анна Валяр'янаўна Куршэўская – жанчына новага часу, яна паводзіла сябе груба, часта непрыстойна лаялася: "Можа, напускная грубасць і частая непрыстойная лаянка Анны Валер'еўны таксама маска, каб скрыць сваё паходжанне і інтэлігенцыю? Ці мо толькі франтавая прывычка?" [3, с. 207]. Калі Паўлінін брат Зыгмусь перад канцэртам у знак прывітання хацеў пацалаваць руку Куршэўскай, тая абурылася, нібыта яе зняважылі.

Адным з прыярытэтаў Паўліны Мядзёлкі было ўсведамленне неабходнасці ва ўсім быць першай і лепшай. Гэта яскрава выявілася ў яе характарыстыцы беларускіх жанчын-адраджэнак Цёткі, Уладзіславы Станкевіч, Канстанцыі Буйло, Палуты Бадуновай. Пра Алаізу Пашкевіч яна зазначыла: "У мяне склалася ўражанне, што Цётка з'яўляецца хутчэй кватаранткай, чымся гаспадыняй у сваім доме. Яна займала асобны пакой, вельмі просценька абсталяваны. На стале, на паліцах – многа кніг. Апраналася Цётка заўсёды ў просценькую чорную сукенку і такі ж чорны жакецік. Гаварыла крыху ў нос, з чыста вясковай інтанацыяй" [2, с. 72]. Разлучніца Палута Бадунова характарызуецца толькі як старая кабета. У паводзінах Канстанцыі Буйло акцэнтуецца яе відавочная няшчырасць (калі ў 1930-я гады арыштавалі мужа Буйло, яна пераконвала Паўліну, што арышт, з пункту гледжання яе мужа, праява зацікаўленасці органаў бяспекі з мэтай перавыхавання чалавека, які дапусціў палітычныя памылкі. Шмат месца ў

“Сцежкамі жыцця” займаюць успаміны пра жонку Янкі Купалы Уладзіславу Францаўну Станкевіч. У кнізе 1974 года яны стрыманыя. Пра нечаканую сустрэчу ў Полацку, дзе Купала служыў у дарожна-будаўнічым батальёне, сказана: “А як жа я здзівілася, калі ў яго кватэры пабачыла і Уладку Станкевічанку! Аказваецца, яны пажаніліся, а я і не ведала пра гэта.

Дзіўна часам жыццё складаецца! Мяркуеш па-свойму, як жыць, а тут што іншае набяжыць. Яшчэ ж, здаецца, так нядаўна ў Вільні Юрэвіч сох па Уладцы, а Уладка па Чэсю Родзевічу млела. Чэсь да Вікці заляцаўся, а Янка адной з нашых дзяўчат прапанаваў падзяліць з ім долю й нядолю ў жыцці, а калі тая адмовілася, прызнаўшыся, што кахае другога, на другі дзень ён, сумны, даў ёй прачытаць свой верш, напісаны ў гэтую ж ноч. І амаль кожны з нашых маладых віленскіх сяброў злучыў сваё жыццё не з тым, з кім збіраўся. Ну, што ж, так, можа, і лепш, так і трэба. Уладзя можа быць больш адпаведнай спадарожніцай жыцця Янкі, чымся тая, другая.

Яна засталася такой самай, як і была, толькі стала быццам спакайнейшай. Як і раней, заўсёды іранічная, рухавая і добрая гаспадыня. Янка неяк моцна змяніўся з таго часу, як апошні раз яго бачыла. Быў ён зграбнейшы, прыгажэйшы ў ваеннай форме земскага саюзу, дзе тады працаваў. Але стаў нейкі занадта сур’ёзны, маўклівы, пануры. У вочы не загляне, не засмяецца, як бывала, не пажартуе. Я нават і мала яго бачыла дома, хіба толькі за абедам. Заўсёды нечым заклапочаны выбягаў з хаты” [2, с. 92]. П. Буржэ неяк зазначыў, што ў самых шчырых прызнаннях жанчыны заўсёды застаецца месца ўмаўчанню. З аднаго боку, Паўліна хваліць Уладзіславу Станкевіч, гаворыць, што яна больш вартая быць з Купалам, чым тая, якая яму адмовіла, а з другога боку – ускосна падкрэслівае, што пасля шлюбу Янка Купала пазмрачнеў.

Ва ўспамінах, надрукаваных ў 1993 годзе, Уладзіслава Станкевіч галоўным чынам адмоўная гераіня: “Імя Уладзі як найлепш адпавядала яе характару. Уся паўната ўлады была ў яе руках. Дыктатар дый толькі! А Янка бязвольна падпарадкоўваўся ёй” [4, с. 199]. Паводле Мядзёлкі, Уладзіслава Францаўна была дамашнім цэнзарам і дамашнім тыранам: “Не раз і Янка Купала паспрабаваў яе кулакоў, нават пры людзях у сваім доме” [3, с. 212]. Паўліна Мядзёлка параўноўвала сябе з Уладзіславай, каб ненавязліва сцвердзіць сваю перавагу перад ёй. Па яе словах, Купалава маці спытала ў яе маці, чаму Паўліна не стала яе “сыновай”, а тая адказала, што дурная была, калі адмовіла такому важнаму чалавеку. На пачатку Вялікай Айчыннай вайны Янка Купала разам з жонкай выехалі з палаючага Мінска. Паўліна пацікавілася, чаму не ўзялі Купалаву маці і сясцёр, і ў адказ пачула: “Мы не маглі ўсіх у адну машыну забраць, адказвае Владка. Яны схаваліся ў падвале. Там жа людзі яшчэ засталіся, памогуць ім выбрацца” [4, с. 201]. “Владка” клапацілася толькі пра сябе. Са слоў шафёра паэта, Уладзіслава Францаўна не дазволіла таму ўзяць дзяцей і хворую жонку. Калі захварэла старая маці, то Паўліна ў 1947 годзе пераехала з Масквы ў Будслаў, каб даглядаць маці. Ва ўспамінах Мядзёлкі, Уладзіслава Францаўна стварала найперш бездакорны імідж Янкі Купалы ў вачах улады, мала цікавілася яго творчасцю, бо архіў Луцэвічы пакінулі ў палаючым Мінску. Узрушаная Паліна, калі даведалася пра падрабязнасці ад’езду з Мінска, заявіла Купалу: “Помні, Янка, за тое, што ты пакінуў у палаючым доме матку і архіў – зямля роднае не прыме ў сваё ўлонне твайго праху” [4, с. 202]. Калі Янка Купала загінуў, то Паўліна адразу паспрабавала высветліць прычыны смерці, хацела развітацца з паэтам, “Владка” ж прыляцела ў ваенную Маскву з Казані толькі праз два дні пасля пахавання паэта. Паўліна Мядзёлка прызнавала, што жонка Купалы шмат намаганняў прыклала для арганізацыі музея паэта. Калі Уладзіслава за фотаздымкі Купалы прапанавала ёй грошы, Мядзёлка абурылася: “Прадаваць памяткі ад яго” [4, с. 205]. Уладзіслава Францаўна нібыта заўважыла: “Ты, Паўліна, заўсёды была і засталася ідэалісткай, а я матэрыялістка, я практычны чалавек і рэальна гляджу на жыццё, не праз ружовыя акуляры, як ты” [4, с. 207]. У трактоўцы Паўліны Мядзёлкі, Уладзіслава Францаўна не разумела і не магла зразумець значэнне свайго мужа.

Цяжка не пагадзіцца з Л.Я. Гінзбург: “Мастацкі вобраз заўсёды сімвалічна рэпрэзентатыўны; ён адзінкавы знак абагульненняў, прадстаўнік шырокіх пластоў чалавечага вопыту, сацыяльнага, псіхалагічнага. Мастак стварае знакі, якія ўвасабляюць думку, і яе нельга аддзяліць ад іх, не разбурыўшы, У мемуарыста іншы ход, як бы зваротны, Ён не можа ствараць падзеі і прадметы, якія яму падыходзяць, Падзеі яму дадзены, і ён павінен раскрыць у іх латэнтную энергію гістарычных, філасофскіх, псіхалагічных абагульненняў, тым самым ператвараючы іх у знакі гэтых абагульненняў. Ён абуджае дарогу ад факта да яго значэння. І ў факце тады абуджаецца эстэтычнае жыццё; ён становіцца формай, вобразам, прадстаўніком ідэі” [1, с. 11]. П.В. Мядзёлка ва ўспамінах выказала свае каштоўнасныя прыярытэты, дзе асноўнае месца адводзілася патрыятызму і служэнню Радзіме, самаадукацыі, самаахвярнасці, грамадскай актыўнасці, усведамленню ўласнай самадастатковасці.

ЛІТАРАТУРА

1. Гинзбург, Л.Я. Психологическая проза/Л.Я. Гинзбург. – Л.: Худож. лит., 1976. – 448 с.
2. Мядзёлка, П. Сцежкамі жыцця. Успаміны/П. Мядзёлка. – Мінск: Маст. літ., 1974. – 242 с.
3. Мядзёлка, П. Сцежкамі жыцця. 1993. – №2. – С. 202–212.
4. Мядзёлка, П. Сцежкамі жыцця. 1993. – №3. – С. 182–209.